**УДК** 796.032 (100):796.032 (476) “5”:001.8

# Метадалогія распрацоўкі перыядызацыі развіцця міжнароднага і беларускага алімпійскага руху

У.М. Старчанка

Прод’яўляецца метадалагічны інструментарый для распрацоўкі перыядызацыі алімпійскага руху, прапануецца класіфікацыя перыядаў развіцця міжнароднага, нацыянальнага і рэгіянальнага алімпійскага руху.

Даследванне алімпійскага руху непазбежна ставіць задачу распрацоўкі класіфікацыі перыядаў яго развіцця, або задачу распрацоўкі перыядызацыі яго развіцця. Абраная пры гэтым метадалогія распрацоўкі мае надзвычай важнае значэнне для вынікаў такой работы.

У працэсе распрацоўкі перыядызацыі мы зыходзілі з дзейнаснай пазіцыі і выкарыстоўвалі агульнавядомыя метады даследвання: метад аналізу навукова-метадычнай літаратуры, метады тэарэтычнага аналізу і сінтэзу, метад тэарэтычнага мадэлявання [3]. Пры гэтым нам было неабходна вырашыць шэраг задач:

- вызначыць прадмет перыядызацыі ў тэарэтычным плане;
- выбраць крытэрыі класіфікацыі;
- правесці пошук, аналіз і сістэматызацыю факталагічнага матэрыялу, які тычыцца дзейнасці міжнароднага і нацыянальнага алімпійскага руху;
- адабраць і ўпарадкаваць факталагічны матэрыял ў адпаведнасці з абранымі крытэрыямі класіфікацыі;
- пабудаваць тэарэтычны канструкт (перыядызацыю), яго лінгвістычна і, пры неабходнасці, візуальна афарміць.

Аднак прад’явім выкарыстаную намі метадалогію распрацоўкі перыядызацыі развіцця алімпійскага руху больш падрабязна.

У аснову перыядызацыі зусім натуральна быў пакладзены фактар часу, бо час – неад’емны атрыбут дзейнасці, а рух як раз ёй і займаецца. Дзейнасць спараджае час, і квант дзейнасці ёсць адзінка для вымярэння часу. Таму ўсе артэфакты дзейнасці (факталагічны матэрыял) размеркаваны ў часе і прывязаны да яго восі. Аднак адбор і ўпарадкаванне факталагічнага матэрыялу мусіць рабіцца на падставе абранага даследчыкам крытэрыю. Крытэрый дазваляе напоўніць адабраным на яго падставе факталагічным матэрыялам створаны даследчыкам тэарэтычны канструкт (перыядызацыю) і гэтым самым яго абгрунтаваць, прывязаць да рэальнасці. Зразумела, што крэтырэй не павінен быць выпадковым, несістэмным, інакш і перыядызацыя атрымаецца не сістэмнай, а эклектычнай. Крытэрый павінен вынікаць з таго тэарэтычнага канструкта, якім даследчык карыстаецца пры распрацоўцы перыядызацыі. Сутнасны (анталагічны) крытэрый вынікае з тэарэтычнай мадэлі алімпійскага руху, якім карыстаецца даследчык. У дзейнасным падыходзе сацыяльны рух – гэта носьбіт дзейнасці, пасярэднік паміж ідэяй і яе матэрыялізацыяй, бо дзейнасць разглядаецца як працэс матэрыялізацыі ідэй (малюнак 1). Адсюль галоўным якасным вынікам (індыкатарам і крытэрыем) дзейнасці міжнароднага алімпійскага руху з’яўляецца факт правядзення (неправядзення) алімпійскіх гульняў. У выпадку правядзення алімпіяды галоўнымі колькаснымі паказчыкамі эфектыўнасці дзейнасці алімпійскага руху (як руху сацыяльнага) з’яўляюцца колькасць спартсменаў-удзельнікаў і краін-удзельнікаў гульняў.

Што тычыцца крытэрыяў для распрацоўкі перыядызацыі развіцця нацыянальнага руху, як элемента руху міжнароднага, то галоўным якасным крытэрыем з’яўляецца факт удзелу (няўдзелу) нацыянальнай каманды ў алімпіядах, а колькасным паказчыкам – колькасць спартсменаў, якія прынылі ўдзел у тых ці іншых гульнях.




Малюнак 1 – *А* – Дзейнасць як працэс матэрыялізацыі ідэй пры пасярэдніцтве агента дзейнасці. *Б* – Алімпійскі рух як носьбіт алімпійскай дзейнасці, пасярэднік паміж алімпійскай ідэяй і яе рэальным ўвасабленнем, якое адбываецца падчас алімпіяд.

Да іншых сутнасных крытэрыяў, якія непазбежна выходзяць на першы план пры перыядызацыі развіцця алімпійскага руху, у тыя часы, калі алімпіяды не праводзяцца, можна аднесці якасны крытэрый наяўнасці (адсутнасці) ў соцыўме алімпійскай ідэі, а, таксама, наяўнасці (адсутнасці) спроб яе матэрыялізацыі праз арганізацыю квазіалімпіяд, і колькасны – ступень пашырэння ў соцыуме, ступень актуалізацыі алімпійскай ідэі, колькасць і частата спроб яе матэрыялізацыі праз правядзенне разнастайных гульняў на ўзор алімпійскіх. Дрэва якасных і колькасных сутнасных крытэрыяў, якія выкарыстоўваліся для распрацоўкі перыядызацыі развіцця міжнароднага алімпійскага руху паказана на малюнку 2.




Малюнак 2 – Дрэва сутнасных крытэрыяў, якія выкарыстоўваліся для распрацоўкі перыядызацыі развіцця міжнароднага алімпійскага руху.

Акрамя таго, пры распрацоўцы перыядызацыі ўлічваліся і знешнія фактары, якія значна ўплывалі і ўплываюць на эфектыўнасць дзейнасці алімпійскага руху. Сярод гэтых фактараў найперш вылучаецца фактар палітычны, бо алімпійскі рух дзейнічае ў канкрэтных геапалітычных умовах, якія могуць не толькі спрыяць яго дзейнасці, але і спараджаць крызісы развіцця накшталт тых, якімі ў 20-м стагоддзі суправаджаліся дзьве сусветныя вайны, калі алімпійскія гульні правесці не ўдалося.

Застаецца дадаць, што ў аснову перыядызацыі былі пакладзены катэгорыі дзейнасці, развіцця, руху і алімпійскага руху, якія трэба было досыць канкрэтна акрэсліць ў сутнасным і сэнсавым планах. Фактапагічнай асновай перыядызацыі сталі вядомыя нам ключавыя падзеі і даты з гісторыі развіцця міжнароднага і нацыянальнага алімпійскага руху. Спецыфіка перыядызацыі развіцця алімпійскага руху Гомельшчыны задавалася ключавымі падзеямі і датамі ў гісторыі яго станаўлення і існавання а, таксама, яго прыналежнасцю да руху нацыянальнага.

У паняцці “рух” (сацыяльны рух) ёсць пэўны дуалізм. З аднаго боку, рух – гэта масавая

грамадская дзейнасць, якая пераследуе нейкую мэту. А з другога боку рух – гэта аб’яднаныя адной мэтай людзі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па рэалізацыі мэты. Прычым абодва вызначэнні адрозніваюцца тым, што трымаюць у фокусе розные (але ўзаемазвязаныя) бакі разглядаемай намі цэласнай з’явы, бо сацыяльная дзейнасць ажыццяўляецца людзьмі, і менавіта людзі з’яўляюцца носьбітамі (агентамі) дзейнасці. Першае вызначэнне ўказвае на сутнасць з’явы – дзейнасць, а другое - на носьбіта дзейнасці (людзей).

Такім чынам, з аднаго боку, *алімпійскі рух* – гэта масавая свядомая дзейнасць людзей, накіраваная на рэалізацыю ў соцыуме алімпійскай ідэі, а з другога – аб’яднанне ахопленых алімпійскай ідэяй людзей, якія ажыццяўляюць дзейнасць, накіраваную на яе (ідэі) рэалізацыю .

Кажучы інакш, алімпійскі рух у’яўляе сабой разгорнутую ў часе і накіраваную пераважна на соцыум дзейнасць носьбітаў алімпійскай ідэі. Функцыянальна алімпійскі рух займаецца рэалізацыяй у соцыуме алімпійскай ідэі, чым і займаюцца яе актыўныя носьбіты праз ажыццяўленне алімпійскай дзейнасці. Па сваёй сутнасці рух з’яўляецца праваднікам алімпійскай ідэі ў соцыуме.

Гістарычна алімпійскі рух узнік і развіваўся як алімпійская дзейнасць алімпійцаў. Аднак логіка развіцця вяла не толькі да ўскладнення і дыферэнцыяцыі відаў і накірункаў алімпійскай дзейнасці, але і ўскладнення і дыферэнцыяцыі яе носьбітаў. Таму на цяперашні час акрамя пазіцыі алімпійца ў сацыяльнай структуры ўдзельнікаў алімпійскага руху можна вылучыць некалькі сервісных роляў-пазіцый: педагог, арганізатар, заўзятар, журналіст, навуковец, метадыст, спонсар, урач... Кожны з іх займаецца абслугоўваннем тых ці іншых аспектаў дзейнасці руху з мэтай павышэння яго эфектыўнасці. Прычым алімпійскі рух, як і любая масавая дзейнасць людзей, мае сваю арганізацыйную структуру: шэраговыя ўдзельнікі, актывісты і лідары рознага ўзроўню па неабходнасці ствараюць арганізаванасці кшталту груп, секцый, таварыстваў, камітэтаў, федэрацый, аб’яднанняў, а таксама інстытуцыі для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў актывістаў і функцыянераў... [5]

Акрамя таго, ў працэсе развіцця алімпійскага руху адбываецца дыферэнцыяцыя алімпійскай дзейнасці на асобныя віды і накірункі, што, між іншым, ёсць прамым сведчаннем наяўнасці развіцця. Як раз з дыферэнцыяцыяй і звязана ўзнікненне ўсё новых сацыяльных роляў-пазіцый удзельнікаў руху. Менавіта праз дыферэнцыяцыю накірункаў алімпійскай дзейнасці рух ускладняецца і пашыраецца. Аднак у гэтым працэсе хаваецца небяспека, звязаная з тым, што ўнутры алімпійскай дзейнасці, побач з асноўнай спартыўнай (трэніроўча-спаборніцкай) дзейнасцю, якая складае яе ідэйна-сэнсавы стрыжань, з’яўляецца ўсё больш дзейнасцей-канкурэнтаў, якія спрабуюць яе сабой падмяніць. Нешта падобнае цяпер адбывецца з камерцыйным напрамкам у алімпійскай дзейнасці, які рэальна прэтэндуе на ролю дамінанты. Аднак, калі цэнтральным стрыжнем алімпійскай дзейнасці сапраўды стане дзейнасць камерцыйная, а не спартыўная, то гэта будзе азначаць канчатковае перараджэнне алімпійскага спорту ў “алімпійскі” цырк, дзе галоўная мэта – зарабіць грошы, а правядзенне алімпійскага шоў (псеўдаспаборніцтваў) – сродак дасягнення мэты. Вось чаму захаванне анталагічнай сутнасці алімпійскага руху, яго ідэйна-дзейнаснай асновы – адна з важнейшых задач для яго арганізатараў-кіраўнікоў і ўдзельнікаў.

Што тычыцца катэгорыі развіцця, то яна мае шмат вызначэнняў з якіх нам найбольш адэкватным падаецца наступнае: развіццё – гэта працэс структурна-функцыянальнага ўскладнення сістэмнага аб’екту, якое суправаджаецца захаваннем ім сваёй анталагічнай сутнасці нягледзячы на набыццё аб’ектам новых (эмерджэнтных) якасцей.

Адсюль *развіццё алімпійскага руху* мы вызначым як мэтанакіраваны і незваротны працэс колькаснага і якаснага павышэння эфектыўнасці алімпійскай дзейнасці, звязаны са структурна-функцыянальным ускладненнем алімпійскага руху, алімпійскай культуры і паглыбленнем алімпійскай ідэі без страты іх (ідэі, руху і самой дзейнасці) анталагічнай сутнасці.

Аднак развіццё алімпійскага руху адбываецца ў часе, які выступае як важнейшы атрыбут дзейнасці  і таму алімпійскі рух непазбежна мае сваю храналогію. Акты, падзеі, факты яго развіцця прывязаны да восі часу.

Такім чынам, факты, звязаныя з колькаснымі і якаснымі трансфармацыямі алімпійскага

руху мусяць быць пакладзены ў аснову перыядызацыі яго развіцця. Напрыклад, “эпоха адраджэння сучасных алімпіяд” ў развіцці сучаснага алімпійскага руху можа быць акрэслена межамі 1450 – 1896 гг.

Прычым выбар дат тлумачыцца наступным чынам.

1450 год можа лічыцца годам рэанімацыі алімпійскай ідэі пасля многіх стагоддзяў забвення ў часы сярэднявечча.

Адраджэнне алімпійскага руху сучаснасці адбылося ў выніку працяглага працэсу, які складаўся з серыі няўдалых спроб. Любая ідэя можа быць успрынята і матэрыялізавана грамадствам у той ступені, у якой яна запатрабавана палітычнымі, эканамічнымі і соцыя-культурнымі ўмовамі яго існавання. Вось чаму ў часы сярэднявечча алімпійскія ідэалы не ўспрымаліся актуальна і не мелі шансаў на практычную рэалізацыю. Аднак з надыходам новых часоў сітуацыя пачала мяняцца. Неабходнасць адраджэння алімпійскай ідэі ўпершыню пачала адчувацца ў эпоху еўрапейскага Рэнесансу, і ў 1450 годзе адбылася першая вядомая нам згадка пра старажытныя алімпіяды ў новым культурным кантэсце. Яна належыла пяру італьянскага палітыка М.Палмеры, які ў названым годзе скарыстаў вобразы антычных алімпіяд у дыскусіі з нагоды падзелу ўладных паўнамоцтваў паміж італьянскімі гарадамі-дзяржавамі, Ватыканам і феадальнымі ўладамі [2].

1896 год – год правядзення першай сучаснай алімпіяды ў Афінах натуральным чынам завяршае эпоху адраджэння алімпіяд і пачынае эпоху правядзення (маніфестацыі) сучасных алімпіяд, эпоху актуальнага існавання алімпійскага руху як ідэйна-сацыяльна-культурнага феномена сучаснасці, што праяўляецца ў рэгулярным правядзенні алімпійскіх гульняў. Названая эпоха працягваецца па цяперашні час і скончыцца тады, калі скончыцца практыка правядзення сучасных алімпійскіх гульняў (або пад гэтай назвай пачнецца правядзенне зусім іншых мерапрыемстваў, якія не будуць непасрэдна звязаныя з алімпійскай ідэяй).

З нагоды таго, што сучасны алімпійскі рух узнік не на пустым месцы, але з’яўляецца пераемнікам алімпійскага руху старажытнай Грэцыі, неабходна ўказаць на яго гістарычнае месца ў агульнай перыядызацыі развіцця алімпійскага руху. Для гэта адзначым, што эпохе адраджэння алімпіяд папярэднічала эпоха забвення алімпіяд старажытнасці (520 – 1450 гг), а ёй – эпоха правядзення алімпіяд старажытнасці (776 г. да н.э – 520 г.н.э.). Дзе 776 г. да н.э. – год правядзення першай алімпіяды старажытнасці (па версіі старажытнагрэцкага гісторыка Цімея). А ў 520 годзе алімпіяда апошні раз згадваецца ў патэнце імператара Юсцініяна, які абнавіў эдыкт Феадосія ад 393 году ў якім імператар забараняў правядзенне алімпіяд.

Схематычна агульная перыядызацыя развіцця алімпійскага руху паказана на малюнку 3.




Малюнак 3 – Агульная перыядызацыя развіцця алімпійскага руху.

Што тычыцца эпохі адраджэння сучасных алімпіяд, то яна можа быць падзелена на некалькі этапаў: этап адраджэння алімпійскай ідэі (1450 – 1604); этап актуалізацыі і спроб правядзення алімпіяд (1604 – 1894); этап падрыхтоўкі першай сучаснай алімпіяды (1894 – 1896).

Этап адраджэння алімпійскай ідэі пачынаецца ўжо згаданым намі вышэй тэкстам М.Палмеры і заканчваецца 1604 годам, калі пад патранажам караля Якава I каралеўскі пракурор Роберт Довер распачаў правядзенне “Англійскіх Алімпійскіх Гульняў”, якія штогод на троіцу праводзіліся на Брайтан-на-Хэсе. Са шматлікімі перапынкамі практыка правядзення гэтых гульняў працягвалася амаль сто гадоў [2]. Этап адраджэння алімпійскай ідэі таксама звязаны з

іменамі паэтаў і драматургаў 16-га стагоддзя Ганса Сакса і Томаса Кіда, якія ў сваёй творчасці займаліся папулярызацыяй алімпійскіх традыцый старажытнай Элады, што моцна паспрыяла вяртанню ў грамадскую свядомаць паняцця аб алімпійскіх гульнях. Нельга не ўказаць і на ролю швейцарца Ёханеса Аквіла, які ў 1516 годзе арганізаваў у Бадзене ўзорныя (паказальныя) алімпійскія выступленні, што можна лічыць першай спробай практычнай матэрыялізацыі алімпійскай ідэі [2].

Этап актуалізацыі і спроб правядзення алімпіяд (1604 – 1894) характарызуецца распрацоўкай алімпійскай ідэялогіі, далейшым пашырэннем алімпійскай ідэі ў грамадскай свядомасці і шматлікімі спробамі правядзення спаборніцтваў на ўзор старажытных алімпіяд. У гэтыя часы ў сферы распрацоўкі ідэялогіі сучаснага спорту працуе Джон Лок (1632 – 1704), які стаў сапраўдным тэарэтыкам фізічнай культуры джэнтльмена. Прадстаўленні аб джэнтльмене, якія склаліся пад уплывам поглядаў Джона Лока пакладзены ў аснову прадстаўленняў аб сучасным спартсмене-алімпійцы. Першым даследчыкам гісторыі алімпіяд стаў англічанін Джылберт Вест (1703 – 1756), які напісаў на гэтую тэму доктарскую дысертацыю [2]. Тэарэтычныя распрацоўкі Чарльза Кінгслі (1819 – 1875) зфармавалі ідэял “хрысціянскага джэнтльмена”, які быў рэалізаваны на практыцы рэктарам коледжу ў Рэгбі Томасам Арнольдам (1795 – 1842), што спарадзіла сусветны рух арнальдызму. Агульнапрызнана, што арнальдызм адыграў галоўную ролю ў закладцы арганізацыйнага і маральнага фундаменту сучаснага спорту. Папулярны ў 18–19 стагоддзях рух філантропаў актыўна займаўся папулярызацыяй і ўкараненнем фізічнага выхавання ў школы еўрапейскіх краін. Як раз выбітнаму дзеячу гэтага руху немцу Гутс-Мутсу (1759 – 1839) належыць ідэя арганізацыі раз на чытыры гады міжнародных гульняў на манер антычных. На этапе які намі разглядаецца пад уплывам агульнай цікаўнасці да гістарычных формаў фізічнай культуры робіцца серыя спроб узнаўлення практыкі правядзення алімпійскіх гульняў. У Швецыі пад назвай “Алімпійскія гульні” раз на два гады праводзяцца ўзорныя выступленні і спаборніцтвы па праграме антычных. У Грэцыі жыхары вёскі Летрыно ў гонар вызвалення ад турак пачынаючы з 1838 года спрабуюць з перыядычнасцю раз на чатыры гады праводзіць антычныя алімпійскія гульні. У Манрэалі (Канада) у 1844 годзе праводзяцца “Алімпійскія гульні”. У 1859 годзе пад эгідай караля Грэцыі адбудоўваецца антычны стадыён у Афінах і праводзяцца лёгкаатлетычныя спаборніцтвы з удзелам грэкаў Кіпру, Александрыі і Малай Азіі. Гэтыя гульні адбываюцца таксама ў 1870, 1875, 1888 і 1889 гг [2]. На гэтым жа этапе разгортваеца самаадданая дзейнасць барона Пьера дэ Кубертэна (1863 – 1937), які праявіў сябе выбітным папулярызатарам і арганізатарам алімпіяд. 15 ліпеня 1889 года ў Парыжы на міжнародным лёгкаатлетычным кангрэсе П’ер дэ Кубертэн упершыню канкрэтна ставіць пытанне аб арганізацыі серыі міжнародных спаборніцтваў па ўзору старажытных алімпіяд. У 1893 годзе ён жа стварае Камітэт па падрыхтоўцы да ўстаноўчага канкрэсу, які і адбываецца 16 чэрвеня 1894 года ў Сарбонскім універсітэце з удзелам прадстаўнікоў 13 краін. На гэтым кангрэсе дэлегаты ствараюць Міжнародны алімпійскі камітэт, якому даручаюць падрыхтоўку і правядзенне першых алімпійскіх гульняў сучаснасці. На гэтым этап актуалізацыі і спроб правядзення алімпіяд можна лічыць завершаным.

Этап падрыхтоўкі першай сучаснай алімпіяды (1894 – 1896) пачынаецца з 1894 году, калі ўстаноўчы кангрэс стварае Міжнародны алімпійскі камітэт, які распачынае падрыхтоўку да правядзення алімпіяды ў Афінах (1896).

На гэтым этапе асаблівае значэнне мае асоба і дзейнасць П’ера дэ Кубертэна. Гэты таленавіты педагог, дыпламат і палітык у складаных палітычных умовах канца 19 стагоддзя здолеў аб’яднаць паплечнікаў, арганізаваць і правесці першыя сапраўдныя Алімпійскія гульні сучаснасці.

Факт паспяховага правядзення першых сучасных алімпійскіх гульняў у Афінах лагічна завяршае этап падрыхтоўкі першай алімпіяды ў гісторыі развіцця сучаснага алімпійскага руху (а з ім завяршаецца эпоха адраджэння сучасных алімпіяд) і распачынае эпоху правядзення сучасных алімпіяд.

Увогуле, трэба адзначыць, што менавіта паспяховае правядзенне алімпійскіх гульняў з’яўляецца галоўным вынікам дзейнасці алімпійскага руху, індыкатарам яго стану. Вось чаму

якасныя (факты правядзення або неправядзення алімпіяд) і колькасныя (колькасць спартсменаў і краін удзельнікаў) паказчыкі з’яўляюцца надзвычай важнымі характарыстыкамі стану міжнароднага алімпійскага руху і мусяць быць улічаны пры стварэнні перыядызацыі яго развіцця. Прычым гады правядзення (неправядзення) алімпіяд з’яўляюцца натуральнымі вехамі на шляху развіцця алімпійскага руху.

З улікам сказанага эпоха правядзення сучасных алімпіяд можа быць падзелена на некалькі этапаў: этап ранняга станаўлення (1896-1912); этап крызісу 1-й сусветнай вайны (1912-1920); этап міжваеннага адраджэння (1920-1936); этап крызісу 2-й сусветнай вайны (1936-1948); этап нестабільнага развіцця часоў халоднай вайны (1948-1988); этап стабілізацыі развіцця (1988 - ...).

У агульным выглядзе этапы развіцця сучаснага алімпійскага руху ў эпохі адраджэння і правядзення сучасных алімпіяд прадстаўлены на малюнку 4.




Малюнак 4. Этапы эпохі адраджэння і эпохі правядзення сучасных алімпіяд.

За аснову перыядызацыі эпохі правядзення сучасных алімпіяд таксама ўзяты фактар палітычны. Справа ў тым, што дзейнасць міжнароднага алімпійскага руху сучаснасці моцна залежыць ад палітычнага кантэксту. Глабальныя палітычныя крызісы 20-га стагоддзя спарадзілі крызісныя этапы і ў развіцці алімпійскага руху, калі з-за сусветных войнаў не былі праведзены алімпіяды 1916, 1940 і 1944 гадоў, а ў часы “халоднай вайны” алімпіяды не аднойчы рабіліся закладнікамі палітычных канфліктаў. Асабліва нестабільным і трывожным выглядаў перыяд паміж алімпіядамі 1972 – 1984 гадоў: алімпіяда 1972 году ў Мюнхене была азмрочана крывавым тэрарыстычным актам, алімпіяда 1976 году ў Манрэалі байкатавалася шэрагам афрыканскіх і арабскіх краін, алімпіяда 1980 году ў Маскве з ініцыятывы ЗША байкатавалася многімі краінамі свету, алімпіяда 1984 году ў Лос-Анджэласе з ініцыятывы СССР байкатавалася краінамі “сацыялістычнага лагера”. І толькі пасля заканчэння перыяда “халоднай вайны” назіраецца этап дастаткова стабільнага развіцця алімпійскага руху. На малюнках 5 і 6 паказана, як палітычныя катаклізмы ўплывалі на правядзенне алімпійскіх гульняў у якасным (па факту правядзення або неправядзенння алімпіяд) і колькасным (колькасць краін-удзельнікаў і колькасць спартсменаў-удзельнікаў) планах.

Безумоўна, што ў аснову перыядызацыі можа быць пакладзены не толькі знешні адносна алімпійскага руху палітычны фактар, але і іншыя крытэрыі. У прыватнасці можна звязаць этапы развіцця алімпійскага руху эпохі правядзення сучасных алімпіяд з імёнамі генеральных сакратароў (прэзідэнтаў) Міжнароднага алімпійскага камітэту (суб’ектыўны крытэрый – асоба арганізатара алімпійскага руху). Пры такім падыходзе перыядызацыя набывае наступны выгляд: этап Дзімітраса Вікеласа (1894 – 1896); этап Пьера дэ Кубертэна (1896 – 1925); этап Анры дэ Байе-Латура (1925 – 1941); этап Зігфрыда Эдстрэма (1941 – 1952); этап Эверы Брендеджа (1952 – 1972); этап лорда Майкла Морыса Кіланіна (1972 – 1980); этап Хуана Антоніа Самаранча (1980 – 2000); этап Жака Роге (2000 – ...) [2]. Таксама ў якасці менш суб’ектыўнага і больш сутнаснага крытэрыя можна абраць крытэрый захавання краевугольных прынцыпаў алімпійскага руху выкладзеных у алімпійскай хартыі. Пры такім падыходзе можна вылучыць этап дзеяння алімпійскай хартыі, этап адмовы ад прынцыпа аматарства, этап

камерцыялізацыі алімпійскага руху і іншыя.

Неад’емнай часткай міжнароднага алімпійскага руху сучаснасці з’яўляецца беларускі алімпійскі рух. У звязку з гэтым перыядызацыя этапаў яго развіцця павінна быць упісана ў перыядызацыю этапаў развіцця сусветнага алімпійскага руху, але павінна мець сваю спецыфіку.




Малюнак 5 – Дынаміка колькасці спартсменаў - ўдзельнікаў летніх і зімовых Алімпійскіх гульняў і яе сувязь з этапамі развіцця алімпійскага руху сучаснасці.




Малюнак 6 – Дынаміка колькасці краін - ўдзельнікаў летніх і зімовых Алімпійскіх гульняў і яе сувязь з этапамі развіцця алімпійскага руху

Безумоўна, што галоўным вынікам дзейнасці нашага алімпійскага руху з’яўляецца ўдзел беларускіх атлетаў у алімпійскіх гульнях, што і мусіць быць пакладзена ў аснову перыядызацыі яго развіцця. З другога боку, нельга не ўлічваць палітычны фактар, бо ўдзел самастойнай беларускай дэлегацыі ў алімпіядах стаў магчымы толькі пасля набыцця Беларуссю дзяржаўнага суверэнітэту. Да таго часу нашы атлеты бралі ўдзел у алімпіядах у складзе каманды СССР.

Акрэслім важнейшыя вехі ў развіцці беларускага алімпійскага руху. Упершыню беларускія атлеты ўзялі ўдзел у алімпіядзе 1952 года ў Хельсінкі. Прычым сем нашых спартсменаў бралі ўдзел у гэтых гульнях у складзе каманды СССР, для якой гэта таксама быў дэбют на алімпійскай арэне, бо нацыянальны алімпійскі камітэт (НАК) СССР быў прызнаны міжнародным алімпійскім камітэтам (МАК) толькі ў 1951 годзе на 45-й сесіі гэтай арганізацыі.

У склад алімпійскай каманды СССР 1952 году былі ўключаны беларускія атлеты – вясляр Стэфан Міхайлаў, лёгкаатлеты Міхаіл Крываносаў, Міхаіл Салтыкоў, Анатоль Юлін, Цімафей Лунёў, фехтавальнікі Юры Дзексбах і Герман Бокун. Алімпійскіх медалёў гэтая дружына ў Хельсінкі не здабыла.

Упершыню пад нацыянальным сцягам нашы атлеты выступалі на алімпіядзе 1992 года ў Барселоне, але фармальна – ў складзе аб’яднанай каманды СНД. 54 беларускіх атлета заваявалі 13 залатых, 4 срэбныя і 5 бронзавых алімпійскіх медалёў.

Упершыню самастойнай нацыянальнай камандай беларускія атлеты выступалі на зімовай алімпіядзе 1994 года ў Лілехамеры. 33 нашых спартсмена прывезлі ў Беларусь 2 срэбныя алімпійскія медалі. (Пасля набыцця дзяржаўнага суверэнітэту ў 1991 годзе Беларусь адкрыла для сваіх спартсменаў новы алімпійскі далягляд. 22 сакавіка 1991 года быў створаны НАК Беларусі, які ў 1992 годзе быў прызнаны МАК у якасці часовага члена, а ў верасні 1993 года на 101-й сесіі МАК наш НАК стаў паўнавартым членам міжнароднага алімпійскага руху.)

На летняй алімпіядзе самастойнай нацыянальнай камандай беларускія атлеты ўпершыню выступалі ў Атланце (1996). 144 пасланцы Беларусі заваявалі 1 залатую, 6 срэбных і 8 бронзавых алімпійскіх медалёў.

Такім чынам, у развіцці беларускага алімпійскага руху можна вылучыць этап лацентнага развіцця (1896 – 1952); этап удзелу ў алімпіядах у складзе каманды СССР (1952 - 1988); этап удзелу ў алімпіядах у складзе аб’яднанай каманды СНД (1988 – 1994); этап удзелу ў алімпіядах нацыянальнай каманды (1994 – ...).

На этапе лацентнага развіцця (1896 – 1952) беларускія атлеты не прымалі ўдзел у алімпійскіх гульнях, але актыўна і паспяхова выступалі на разнастайных міжнародных спаборніцтвах, што садзейнічала заваяванню спартыўнага аўтарытэта.

На этапе ўдзелу ў алімпіядах у складзе каманды СССР (1952 - 1988) нашы атлеты ўзялі ўдзел ў 9 летніх і 4 зімовых алімпіядах. У колькасных адносінах прадстаўніцтва беларусаў у складзе каманды СССР ад алімпіяды да алімпіяды паступова павялічвалася ад 7 (алімпіяда 1952) да 50 (алімпіяда 1988) чалавек. Што тычыцца зімовых алімпіяд, то беларускія атлеты ўдзельнічалі толькі ў гульнях 1964, 1968, 1984, 1988 гадоў, прычым склад нашай дэлегацыі не перавышаў 1-2 чаславек.

На этапе ўдзелу ў алімпіядах у складзе аб’яднанай каманды СНД (1988 – 1994) беларускія спартсмены ўзялі ўдзел у летніх гульнях 1992 году ў Барселоне (54 атлеты) і зімовых гульнях гэтага ж году ў Альбервілі (3 атлеты).

На этапе ўдзелу ў алімпіядах нацыянальнай каманды Беларусі (1994 – ...) нашы атлеты прынялі ўдзел ў 4 летніх і 4 зімовых алімпійскіх гульнях. Прычым колькасны склад беларускай каманды ў цэлым павялічыўся як на летніх (144 → 134 → 151 → 181), гэтак і зімовых (33 → 59 → 64 → 28 ) гульнях [1; 4].

Суадносіны этапаў развіцця беларускага і сусветнага алімпійскага рухаў эпохі правядзення сучасных алімпіяд паказаны на малюнку 7.

Дынаміка колькасці беларускіх атлетаў, якія бралі ўдзел ў летніх і зімовых алімпійскіх гульнях і яе сувязь з этапамі развіцця беларускага алімпійскага руху паказана на малюнку 8. Лёгка заўважыць, што на этапе ўдзелу ў алімпіядах нацыянальнай каманды колькасць беларускіх алімпійцаў значна павялічылася, што сведчыць пра паскарэнне тэмпаў развіцця

беларускага алімпійскага руху.




Малюнак 7 – Суадносіны этапаў развіцця беларускага і сусветнага алімпійскага рухаў эпохі правядзення сучасных алімпіяд.




Малюнак 8 – Дынаміка колькасці беларускіх атлетаў, якія бралі ўдзел ў летніх і зімовых алімпійскіх гульнях і яе сувязь з этапамі развіцця беларускага алімпійскага руху.

Што тычыцца рэгіянальных аддзяленняў беларускага алімпійскага руху, то кожны з іх мае сваю гісторыю развіцця, якая ўпісваецца ў кантэкст развіцця руху нацыянальнага і сусветнага. Напрыклад, перыядызацыя развіцця алімпійскага руху Гомельшчыны ў цэлым супадае з перыядызацыяй развіцця руху нацыянальнага (Малюнак 9.).

У развіцці алімпійскага руху Гомельшчыны можна вылучыць наступныя этапы: этап лацентнага развіцця (1896 – 1952); этап эпізадычнага ўдзелу ў алімпіядах у складзе каманды СССР (1952 – 1988); этап удзелу ў алімпіядах у складзе аб’яднанай каманды СНД (1988 – 1994); этап удзелу ў алімпіядах у складзе нацыянальнай каманды (1994 – ...).

На этапе лацентнага развіцця (1896 – 1952) атлеты Гомельшчыны не прымалі ўдзел у

алімпійскіх гульнях, але актыўна і паспяхова выступалі на разнастайных міжнародных спаборніцтвах.




Малюнак 9 – Дынаміка колькасці атлетаў Гомельшчыны, якія бралі ўдзел у летніх і зімовых алімпійскіх гульнях і яе сувязь з этапамі развіцця алімпійскага руху

На этапе эпізадычнага ўдзелу ў алімпіядах у складзе каманды СССР (1952 – 1988) гомельскія спартсмены выступалі на 7 алімпіядах з 10. Прычым у колькасных адносінах склад гомельскай дружыны вар'іраваў ад 1 да 6 чалавек.

На этапе ўдзелу ў алімпіядах у складзе аб'яднанай каманды СНД (1988 – 1994) ужо 10 гомельскіх спартсменаў ўзялі ўдзел у алімпіядзе 1992 году ў Барселоне.

На этапе ўдзелу ў алімпіядах у складзе нацыянальнай каманды (1994 – ...) гомельскія атлеты ўжо ўзялі ўдзел у чатырох летніх і двух зімовых алімпіядах. Прычым іх прадстаўніцтва ў складзе беларускай нацыянальнай каманды з кожнай летняй алімпіядай няўхільна павялічваеца (15 → 17 → 23 → 29 чалавек) [1,4]. Што тычыцца зімовых алімпіяд, то на гэтым этапе гомельскія атлеты ўзялі ўдзел у гульнях у Солт-Лэйк-Сіці (2002) – 2 спартсмены і ў Турыне (2006) – 1 спартсменка. Таксама трэба адзначыць, што ў арганізацыйным плане вехай ў развіцці алімпійскага руху Гомельшчыны стаў 1996 год, калі па рашэнню Алімпійскага сходу Беларусі было створана прадстаўніцтва НАК Беларусі ў Гомельскай вобласці. Аналагічныя прадстаўніцтвы былі створаны і ў іншых абласцях краіны, а таксама ў сталіцы.

## РЭЗЮМЕ

Зыходзячы з абранай намі метадалогіі распрацоўкі перыядызацыі ў гісторыі развіцця міжнароднага алімпійскага руху можна вылучыць наступныя эпохі:

– эпоха правядзення алімпіяд старажытнасці (776 г. да н.э – 520 г.н.э.);
– эпоха забвення алімпіяд старажытнасці (520 – 1450 гг);
– эпоха адраджэння сучасных алімпіяд (1450 – 1896 гг);
– эпоха правядзення сучасных алімпіяд (1896 – ...).

Эпоха адраджэння сучасных алімпіяд (1450 – 1896 гг) можа быць падзелена на наступныя этапы:

– этап адраджэння алімпійскай ідэі (1450 – 1604);
– этап актуалізацыі і спроб правядзення алімпіяд (1604 – 1894);
– этап падрыхтоўкі першай сучаснай алімпіяды (1894 – 1896).

Эпоха правядзення сучасных алімпіяд (1896 – ...) можа быць падзелена на наступныя

этапы:

– этап ранняга станаўлення (1896-1912);
– этап крызісу 1-й сусветнай вайны (1912-1920);
– этап міжваеннага адраджэння (1920-1936);
– этап крызісу 2-й сусветнай вайны (1936-1948);
– этап нестабільнага развіцця часоў халоднай вайны (1948-1988);
– этап стабілізацыі развіцця (1988 - ...).

У гісторыі развіцця беларускага алімпійскага руху эпохі правядзення сучасных алімпіяд можна вылучыць наступныя этапы:

– этап лацентнага развіцця (1896 – 1952);
– этап удзелу ў алімпіядах у складзе каманды СССР (1952 - 1988);
– этап удзелу ў алімпіядах у складзе аб'яднанай каманды СНД (1988 – 1994);
– этап удзелу ў алімпіядах нацыянальнай каманды (1994 – ...).

У развіцці алімпійскага руху Гомельшчыны можна вылучыць наступныя этапы:

– этап лацентнага развіцця (1896 – 1952);
– этап эпізадычнага ўдзелу ў алімпіядах у складзе каманды СССР (1952 – 1988);
– этап удзелу ў алімпіядах у складзе аб'яднанай каманды СНД (1988 – 1994);
– этап удзелу ў алімпіядах у складзе нацыянальнай каманды (1994 – ...).

Прад'яўленая вышэй перыядызацыя развіцця алімпійскага руху можа быць выкарыстана яго даследчыкамі ў якасці тэарэтычнага і практычнага інструментарыя.

Літаратура

1 Гомельщина олимпийская / сост. И.Ф.Штейнер; авт. текста Старченко В.Н., Боровская А.И., Севдалев С.В., Ханеня С.И. – Минск: Литература и искусство, 2007. – 160с.: ил.

2 Кун, Л. Всеобщая история физической культуры и спорта. М.: Радуга, 1982. – 399 с.

3 Рузавин, Г.И. Методология научного исследования: Учеб. пособие для вузов. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 1999. – 317 с.

4 Старчанка, У.М. "Некаторыя статыстычныя характарыстыкі алімпійскага руху Гомельшчыны", международная научно-практическая конференция "Акмеологические основы становления педагога-профессионала в образовательных системах на современном этапе», 23-24 ноября 2007 г.: в 2 ч. - Гомель, Гомельский ГОИПК и ППР и СО, 2007. – ч.2. С.93-98.

5 Старченко, В.Н. "Идейная и социальная составляющие олимпийского движения древней Греции", международная научно-практическая конференция / под ред. Н.В.Кухарева. – Гомель: ГГОИПК, 2006. Вып. VIII. – Ч.2 – С. 77 – 81.